Установа адукацыі «Лідскі дзяржаўны політэхнічны каледж»

# Метадычная распрацоўка

# Літаратурная гасцёўня "Бацькоўская хата"



Распрацавала
выкладчык рускай мовы
і літаратуры
Дунай А.А.

2023 г.

Анатацыя

Метадычная распрацоўка прысвечана тэме гісторыі роднага краю, традыцыям народа, культурным каштоўнасцям. Будзе цікавай для настаўнікаў, якія праводзяць пазакласную работу з навучэнцамі ў дадзеным накірунку.

# Уводзіны

Кожны чалавек павінен ведаць свае карані, захоўваць духоўную культуру мінулых пакаленняў, перадаваць яе нашчадкам, каб прывіваць любоў да роднай зямлі. А родная зямля – гэта той куточак, дзе нарадзіўся, дзе жывуць бацькі, адкуль ты сам пайшоў у вялікі свет.

Хата – тое месца, якое для кожнага чалавека застаецца і прытулкам, і ўспамінамі аб дзяцінстве, і той маленькай радзімай, без якой сябе немагчыма нават уявіць.

У дадзенай метадычнай распрацоўцы тэма беларускай хаты прадстаўлена ў форме тэатралізаванай гасцеўні. Гэта дапамагае лепш уявіць сябе ў аўтэнтычнай атмасферы беларускага сялянскага побыту, а таксама дае магчымасць удзельнікам інсцэніроўкі раскрыць свае творчыя здольнасці.

У настаўнікаў- філолагаў двайная місія: не толькі вучыць, але і выхоўваць. Дык вось, пазакласная работа якраз і дапамагае дапаўняць урокі мовы і літаратуры, замацоўвае і пашырае тыя веды, якія атрыманы на ўроку—з аднаго боку, з другога—у час пазакласных мерапрыемстваў адбываецца духоўна-маральнае, эстэтычнае, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне навучэнцаў.

Тэатралізаваная гасцеўня “Бацькоўская хата” не пакінула абыякавымі ні гледачоў, ні ўдзельнікаў. Навучэнцы пашырылі свае веды па гісторыі роднага краю, аб жыцці сваіх продкаў. Творчая атмасфера дапамагла кожнаму адчуць сябе часткай аднаго цэлага, замацаваць сяброўскія зносіны.

## Тэатралізаваная гасцёўня “Бацькоўская хата”

**1 вядучы:**
Як соладка спіцца
У матчынай хаце.
Тут месяц глядзіцца,
Тут зоркі раяцца.

Тут шляху пачатак
І сілы крыніца.
Бацькоўская хата –
Радзімы зямліца.

**2 вядучы:**
Бацькоўская хата – гэта месца, дзе чалавек праводзіць большую частку жыцця, месца, сагрэтае цеплынёй матчыных рук, куточак маленства, дзе дзіця робіць першыя крокі. Гэта месца, дзе цябе заўсёды чакаюць, тут утульна і спакойна, тут ты адчуваеш сябе ў небяспецы.

**1 вядучы:**
Не сакрэт, што зараз многія імкнуцца ў гарады і аграгарадкі. А гараджане ўсё меней узгадваюць мінулае і не цікавяцца тым, як быў усталяваны вясковы побыт продкаў.

**2 вядучы:**
І сёння ў нас ёсць магчымасць “зазірнуць” у мінулае, а дакладней – наведаць вясковую хату былых часоў. Канешне, уздыхаць па старых рэчах, вяртацца да старога ўкладу жыцця не варта, але ведаць, як жылі нашы дзяды-прадзеды, трэба.

**1 вядучы:**
Запрашаем вас у бацькоўскую хату!

**Заходзяць госці. У хаце дзяўчынка** *(мяце хату ад парога )*.

**1 госць:**
Добры дзень у хату!

**Дзяўчынка:**
Добры дзень!

**2 госць:**
А ты адна дома?

**Дзяўчынка:**
Ды вось гасцей чакаем, тата з матулей ежу гатуюць, а я хату мяту.

**3 госць:**

Хату мяцеш? Ад парога хату не мятуць.

**Дзяўчынка:**
Ай, ці так важна, як месці, галоўнае ж, каб чыста было.

**1 госць:**
Яно так, але хіба табе бабуля не казала, што парог у хаце — месца незвычайнае, з ім звязана мноства народных звычаяў і прыкмет?

**Стоп-кадр.**

**1 вядучы:**
Парог лічыўся ў народзе месцам, дзе жывуць душы продкаў. З гэтым звязаны розныя звычаі, якія дайшлі да нас з часоў сівой даўніны. Найбольш вядомы з іх — гэта сядзенне перад парогам напярэдадні паездкі, падарожжа. Кажуць: прысядзем на дарожку. Абавязкова трэба маўчаць. Гэта сімвалізавала далучэнне да свету продкаў-нябожчыкаў, якія быццам дапамагалі ў дарозе.
Вядома прыкмета, якая забараняе вітацца праз парог, бо гэта можа прывесці да спрэчкі, непаразумення паміж людзьмі.

**2 вядучы:**
А вось яшчэ якія існуюць звязаныя з парогам прыкметы.
Чалавека, які ўваходзіць у хату і спатыкнецца аб парог, чакае непрыемнасць. Народная этыка не дазваляе садзіцца або станавіцца на парог. Асабліва асцерагацца гэтага павінны хлопцы і дзяўчаты, інакш іх чакае адзінота.

**1 вядучы:**
Патрэбна сказаць, што для людзей, якія пакідалі сваю хату, менавіта парог станавіўся пэўным сімвалам роднага дому. Месці хату патрэбна да парога, як бы вымятаючы з хаты ўсё дрэннае.

**Заходзяць Гаспадар і Гаспадыня.**

**1 госць:**
Добры дзень, даражэнькія гаспадары!

**2 госць:**
Мір вашаму дому, быць пірагу ядому!

**1 госць:**
Даўно да вас збіраліся, ды ледзь-ледзь сабраліся.

**Гаспадар:**
Бачыць вас у нашай хаце мы заўсёды рады.

**Гаспадыня:**
Праходзьце, шаноўныя госцейкі. Чакалі вас, ледзь дачакаліся!

**2 госць:**

Чалом вам б’ём, у ножкі кланяемся. А ці знойдзецца для нас месцейка цёпленькае ў вас? Ды добрае слоўца?

**Гаспадар:**

Давайце бліжэй да печы, тут самае цеплае месца.

**Стоп-кадр.**

**1 вядучы:**

Пры ўваходзе ў хату нас сустракае печ. Яна займае ў сялянскай хаце важнае і пачэснае месца. Абагравае хату, у ёй гатуюць ежу, на ёй спяць, адпачываюць, лечацца.

Да печы адносіліся як да жывой істоты. Забаранялася ўжываць «у яе прысутнасці» грубыя або непрыстойныя словы: «Няможна гэтак казаць, бо печ у хаце».

**2 вядучы:**

Печ (а дакладней – падпечак) – месца знаходжання добрага духа – дамавіка, галоўныя «абавязкі» якога – клопат пра дабрабыт сям’і.

З печчу звязана шмат цікавых звычаяў. Кума, перш чым перадаць маці ахрышчанае дзіця, пасля вяртання з царквы абносіла яго тройчы вакол печы, «каб дзіця любіла хату і трымалася яе».

**1 вядучы:**

Сваты, збіраючыся ісці сватаць дзяўчыну, дакраналіся да печы ў сваім доме, «каб быў лад». Прыйшоўшы ў хату будучай нявесты, яны перш за ўсё набліжаліся да печы і ціхенька звярталіся да яе: «Печ, печ, памажы!» Пасля віталіся з гаспадарамі, садзіліся на лаву і пачыналі гаворку.

**Гаспадыня:**

Госцікі, даражэнькія, сагрэліся? Праходзьце ў чырвоны кут, сядайце!

**Стоп-кадр.**

**1 вядучы:**

Самым пачэсным месцам у хаце быў і застаецца ў наш час чырвоны кут, або покуць. Покуць спрадвеку ачышчала і ўзвышала чалавека, рабіла яго лепшым. Покуць — гэта куточак храма ў хаце. Прыходзіла свята — Каляды ці Вялікдзень, і на покуці першы садзіўся гаспадар, а злева ад яго астатнія сямейнікі. І не абы як, а па старшынстве, дарослыя і дзеці. Маліліся, успаміналі добрым словам дзядоў-прадзедаў, частаваліся.

**2 вядучы:**

Покуць прыгожа ўбіраецца. На абразы гаспадыня вешае ўзорныя ручнікі - набожнікі. І зімою тут залацяцца галінкі асвечанай вярбы, пучкі жытнёвых каласоў і

траў. За абразамі трымаюць шкляначку са свянцонай вадою, якую ўжывалі ў якасці лекаў ад розных хвароб.

**1 госць:**
Ой, як жа прыгожа ў вашай хаце!

**2 госць:**
Колькі розных рэчаў! І амаль усе гаспадаром зробленыя.

**Стоп-кадр**

**1 вядучы:**
Ажыўлялі вясковую хату рэчы, зробленыя рукамі гаспадароў і вясковых умельцаў.

Вось перад вамі бойка. Калі малако адстойвалася ў збанках, гаспадыня збірала зверху смятану – густы, тлусты слой . Назапашвала смятаны ўдосталь і біла з яе ў бойцы масла.

Масла білі ўручную. Збіўшы масла, злівалі ў збанкі маслёнку. Кіславатая, з залацістымі крупінкамі масла, яна смачна сёрбалася потым з цёплаю бульбаю.

**2 вядучы:**
Прыгадваецца казка пра дзвюх жабак, якія трапілі ў пастку – збанок са смятанаю. Адна жабка адразу змарылася, здалася і патанула ў смятане. А другая, упартая, доўга працавала лапкамі, як калатоўкаю, і збіла са смятаны масла. Стала на грудку масла і выскачыла са збанка на волю. Казка цікавая і павучальная: ніколі не падайце духам, сябры, верце ў свае сілы – і зможаце выбрацца з любой пасткі.

**1 вядучы:**
Гэта – збан. Пасудзіна добра вядомая. У ім звычайна трымалі малако: доўга не скісае, а ў гарачыню – халоднае. Бакі ў збана выпуклыя, шыйка – звужаная. Мае ручку і носік-дзюбку, каб тое ж малако лёгка, роўным струменьчыкам лілося ў міску ці ў куфаль.

**2 вядучы:**
У кожнай сялянскай хаце можна было ўбачыць зручны абутак, плецены з лыка, бяросты ці пянькі. Лыка дралі найчасцей з маладой ліпы, сушылі ў клеці або на гарышчы хаты. Потым стужкі кары, каб яны не ламаліся, размочвалі ў цёплай вадзе. І плялі лапці. Плялі на драўлянай калодцы. Стужкі лыка шчыльна падганялі адна да адной. Па баках пакідалі петлі-вушкі, у якія зацягваліся аборы – вераўчаныя ці раменныя шнуркі. Аборамі лапці прывязваліся да ног. А на ногі накручваліся палатняныя анучы, зімою – суконкі, каб цяплей было. Падэшву для трываласці падплялі тым жа лыкам, пянькою, зрэдку падшывалі скураю.

Лапці і сёння «скрыпяць» у народных казках і песнях. І не лапаць, вядома, вінаваты, а сам чалавек, калі з яго, недарэкі, смяюцца: «Лапаць ты!»

**1 вядучы:**

Быў час, калі ў вёсцы ўсе былі папрадухамі: маці вучыла прасці дачку, бабка – унучку. Пралі за прасніцаю. Некалі прасніцу рабілі з суцэльнага кавалка дрэва. Для гэтага дрэва выкопвалі з каранямі, адпілоўвалі ніжнюю частку. Высякалі, гладка вычэсвалі зверху лопасць, а ўнізе пакідалі адзін корань – для апоры і каб было на што сесці гаспадыні – папрадусе. Прасніцу, бывала, з густам аздаблялі: выразалі на лопасці выявы жывёл, птушак, лісцікі, пялёсткі.

**Гаспадар:**
А зараз запрашаем вас усіх за стол пачаставацца.

**Стоп-кадр**

**1 вядучы:**
А стол у хаце лічыўся амаль што свяшчэнным, бо думалі, што праз стол у чырвоным куце наладжваецца сувязь з Богам, з небам.

**2 вядучы**
Святасць стала вызначалася яшчэ і тым, што на яго клалі самае дарагое — хлеб, свянцоныя свечкі, святую ваду. На стол ніколі не клалі шапку, грэбень, ключы ці торбу, не пакідалі на стале нож. На стол нельга было пускаць кошку ці неразумнае дзіця, нельга было дарослаdensitet сесці на стол ці стаць нагамі на яго, бо ён свяшчэнны.

**1 вядучы:**
Бацькоўскі стол у хаце гаспадар.
Сям'ю гуртуе ды гасцей частуе.
І, наліваючы сыту густую,
Салодзіць хмель, як шчодры вінадар.

**Госці падымаюцца і разам з гаспадарамі становяцца перад гледачамі.**

1. Ёсць такая легенда. Чалавеку сказалі, каб ён, адыходзячы з хаты, не азіраўся назад, іначай ператворыцца ў слуп солі.
2. Чалавек азірнуўся... Дый як жа не азірнешся, калі родная сядзіба – гэта цэлы свет.
3. Наперадзе, за таямнічаю мяжою гарызонта – новыя дарогі, новыя людзі, новы свет.
4. Але на ўсё астатняе жыццё застаюцца ў памяці “парог, высечаны з успамінаў, дзверы на завесах цвыркуновай песні; вокны, зашклёныя вачамі блізкіх; хата, пакрытая крыламі ластавак...”
5. Часцей азірайцеся, сябры, назад, у мінулае, каб не пагасла свечка на покуці ў бацькоўскай хаце, каб лягчэй было ісці наперад, у будучыню.

1. Чакае нас мноства дарог.
Нас вабяць і далі, і высі.
Але на бацькоўскі парог
Абавязкова вярніся.

# Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Баханькоў, А.Я. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: Для сярэд.школы. – 3-е выд. – Мн.; Нар.асвета, 1979. – 334 с.
2. Грышкевіч, І.К. Спадчына маёй краіны: матэрыял для азнаямлення дзяцей з гісторыяй і культурай Беларусі. У дзвюх частках. Ч.2 / І.К.Грышкевіч. – 2-выд. – Мазыр: Содействие. – 2006. – 124 с.
3. Гурскі, А.І. Легенды, паданні, сказы. – Мінск, 1996. – 154с.
4. Лыч, Л. Міжэтнічныя працэсы на Беларусі ў люстэрку тапаніміі / Л.Лыч // Роднае слова. “Беларуская мова і літаратура ў школе”.– 1992. - № 2. – С.9.
5. Фядосік, А.С., Пятроўская, Г.А. Народная спадчына: Для сярэд.і ст.шк.узросту. – Мн.: Нар.асвета, 1984. – 208 с.
6. Цітова, Л.К. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. Для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання. У 2 ч. Ч.1 / Л.К.Цітова. – Мінск: Нац.ін-т адукацыі, 200

Дадатак


Зямля нашых продкаў


Зямля нашых продкаў
У складзе Расійскай імперыі
На крутым павароце гісторыі
Сведкі мінулага


Зямля нашых продкаў




Зямля нашых продкаў
У складзе Расійскай імперыі
На крутым павароце гісторыі
Сведкі мінулага


Зямля нашых продкаў

